Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Да трох з паловай і чатырох гадоў калоніі асудзілі яшчэ двух фігурантаў "пінскай справы"

21.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

**У судзе Ленінскага раёна Брэста 21 кастрычніка вынеслі прысуды двум фігурантам "пінскай справы". Палітзняволенага Іллю Бохана і Сцяпана Дразда суддзя Андрэй Грушко прызнаў вінаватым па ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (удзел у масавых беспарадках) і асудзіў да трох з паловай і чатырох гадоў калоніі адпаведна. Менавіта такое пакаранне запрасіла для іх пракурорка Алена Ціхановіч. Гэта ўжо трэцяя асуджаная група па "пінскай справе" — агулам за ўдзел у акцыях пратэсту ў Пінску з 9 на 10 жніўня пазбавілі волі 26 чалавек. "Вясна" распавядае, што вядома пра суд над трэцяй групай фігурантаў гэтай гучнай справы.**




*Пінск, 9 жніўня 2020 года*

# Спрабаваў зламаць дрэва. У чым абвінавацілі Бохана і Дразда?

Як піша "Брэсцкая вясна", паводле версіі абвінавачвання, Сцяпана Дразда абвінавацілі ў замахах (але не ўдарах) рукамі, адным удары па міліцэйскім шчыце, які ў сваю чаргу зачапіў нагу супрацоўніка АУС **Паліводы**. Згодна з зачытаным на судзе вынікам медэкспертызы ад 12 жніўня 2020, у Паліводы "выяўленая рана на левай назе даўнасцю ад 2 да 6 сутак". Дзяржабвінавачванне заявіла, што "не выключае яе ўтварэнне ад удару Драздом па шчыце і пасля па гэтай назе". Відэа з ударам нагой па шчыце мелася ў матэрыялах справы.

На судзе Дрозд тлумачыў, што хацеў прайсці міма, але міліцыя са шчытамі перагарадзіла дарогу. У нейкі момант яго штурхнулі шчытом, упаў, рассек калена і пайшла кроў. Дразда паднялі людзі, што стаялі побач. Дрозд ускідваў рукі ў абурэнні, і адзін раз рэзка паправіў рукаў — па версіі абвінавачанага, менавіта гэта можа быць падобна на кідкі на знятым з-за спін міліцыянтаў відэароліку.

Ілля Бохан, якому ў жніўні 2020 яшчэ не было 18 гадоў, паводле версіі абвінавачвання, удзельнічаў у "масавых беспарадках" тым, што кінуў у строй міліцыі алюмініевую бляшанку з-пад энергетыка. Аднак канкрэтны міліцыянт, у каго даляцела бляшанка, дзяржабвінавачаннем на называецца. І з міліцыянтаў ніхто Бохана ў судзе не пазнаў. Таксама Бохану ставіцца ў віну, што ён падышоў да дрэва, пачаў схіляць яго ў бок каб зламаць — але нічога не выйшла. У зале суда супрацоўнік "Зелянбуда" растлумачыў, што дрэва выжыла, не зламалася. Тым не менш, яго арганізацыя падрыхтавала пазоў, кошт дрэва ацэнены бухгалтэрыяй у **117 беларускіх рублёў.**

# Зрабіў прапанову сваёй дзяўчыне. Пра што казалі ў апошнім слове абвінавачаныя?

У сваім апошнім слове Сцяпан Дрозд быў кароткі:

> *"Я казаў, што не згодны з тым, што мне прад'явілі. Ніякіх супрацьпраўных дзеянняў я не здзяйсняў. Я проста не магу зразумець, як дзеці будуць расці без мяне. Чалавека пакараць можна за нейкія імгненні, але гэта пакаранне — яно неабгрунтаванае. Я лічу, што Высокі суд неяк улічыць гэта і вынесе правільны прысуд. Мне больш сказаць няма чаго".*

Ілля Бохан жа сказаў больш доўгую прамову, у якой нават зрабіў прапанову рукі і сэрца сваёй дзяўчыне:

> *"Высокі суд, я прашу Вас аб'ектыўна разабрацца ў дадзенай сітуацыі і праявіць міласэрнасць у знак спагады да маіх родных, каханай дзяўчыны, даць мне шанец на выпраўленне. Я глыбока ўсё ўсвядоміў і мне вельмі сорамна за ўчынак, які я здзейсніў. Калі б можна было вярнуць час назад... Прашу строга не караць мяне, улічыць, што я быў непаўнагадовы, не абдумваў свае ўчынкі. Раней не судзімы. Я праўда не хацеў прычыніць нікому боль, я не ішоў з думкай кагосьці біць, кідаць палкі.*
>
> *Я ў чымсьці вінаваты, так. У тым, што кінуў гэтую бутэльку, што спрабаваў зламаць дрэва — і ўсё. Прашу прабачыць мне за гэты ўчынак і паставіцца справядліва. Прашу прабачэння за нейкія нязручнасці, якія прадаставіў, у пракурора і ў вас, Высокі суд.*
>
> *Я вельмі ўдзячны бацькам, што падтрымліваеце мяне, дапамагаеце, чакаеце мяне. Я вас вельмі моцна люблю. У вас усё будзе добра, я веру, абяцаю, усё выпраўлю. Я разумею, колькі на вашы плечы ўпала. Я вінаваты перад вамі, мне вельмі сорамна. Шчасця, здароўя, дабрабыту".*

Суддзя Андрэй Грушко перапыняе прамову Бохана:

> *"Па сутнасці справы ёсць яшчэ нешта? Гэта не спатканне, што вы так размаўляеце".*

Пасля гэтага абвінавачаны Бохан звярнуўся да сваёй дзяўчыны:

> *"Яна, [..] у мяне ёсць ты. Кахаеш мяне? — Так. — І ў любым выпадку дачакаешся? — Так. — Прабач, што тады накрычаў на цябе. Я цябе вельмі моцна кахаю. Я ўдзячны Богу, што сустрэў цябе. Я хачу зрабіць табе прапанову. Янка, выходзь за мяне замуж. Прабач яшчэ раз за ўсё".*

## Чым усё скончылася?

Іллю Бохану дзяржабвінавачанне 5 кастрычніка запрасіла 3 гады 6 месяцаў калоніі агульнага рэжыму, Сцяпану Дразду — 4 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. Суддзя Андрэй Грушко 21 кастрычніка прызначыў менавіта такое пакаранне.



### 14 палітвязняў "пінскай справы" пазбавілі волі на тэрміны ад 5,5 да 6,5 гадоў

Суддзя Яўген Брэган асудзіў усіх 14 палітвязняў на тэрміны ад пяці з паловай да шасці з паловай гадоў калоніі.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



## "Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

## Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

## "Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

## "КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

## Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



## #ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць залежнікамі" – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ






## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY